УДК 37. 011.3

*В.Я.ДРАЗДОВА, В.В.ЛІХАНЕНКА*

# ВЫХОЎВАЮЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ – АСНОВА ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ

Эканамічная і палітычная нестабільнасць, якая ўзнікла ў краіне некалькі гадоў назад, прывяла да з'яўлення ў грамадстве цэлага рада негатыўных з'яў: азлобленасці і эгаізму моладзі, пагаршэння навакольнага асяроддзя, няўпэўненасці людзей у заўтрашнім дні. У сувязі з гэтым змяніўся прэстыж духоўнасці і маральнасці.

Школа як частка грамадскай сістэмы таксама не змагла пазбегнуць маральнага крызісу, які ахапіў грамадства ў цэлым. За апошнія гады значна панізілася яе выхаваўчая функцыя.

Сучасныя даследчыкі выхаваўчай работы ў школе (У.Т.Кабуш, Б.Ц.Ліхачоў, І.Ф.Харламаў, Н.Я.Шчуркова і інш.) адзначаюць, што адным з галоўных недахопаў сістэмы выхавання з'яўляецца празмерная заарганізаванасць, аўтарытарызм і застой у развіцці школы. Гэтыя недахопы негатыўна ўплываюць на выбар і праяўленне ініцыятывы як з боку выхаванца, так і з боку выхавальніка. Традыцыйны змест выхаваўчай работы прывёў да таго, што выхаванне засталося адарваным ад рэальнага жыцця. Дзеці існавалі для сістэмы, а не сістэма для дзяцей. Дапушчана памылка: такія вечныя маральныя якасці духоўнага жыцця, як дабрыня, міласэрнасць, чэснасць, справядлівасць, засталіся за бортам ідэалогіі і маральнага выхавання. Фарміраванне асобы адбывалася пад уплывам выпадковых, нярэдка негатыўных фактараў, што садзейнічала стыхійнаму развіццю ў грамадстве злачыннасці, крывадушша, здрадніцтва.

Настаў час правядзення рэформы агульнаадукацыйнай школы. Разам з пошукамі эфектыўных метадаў і прыёмаў навучання педагагічная грамадскасць школ вядзе шырокі пошук новых падыходаў да арганізацыі працэсу

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

выхавання. Ставіцца пытанне аб перагладзе зместу выхаваўчай работы ў школе з улікам сацыяльна-эканамічных, палітычных і педагагічных умоў. Важна падкрэсліць, што школе рэкамендаваліся розныя сістэмы выхавання, але ні ў адной з іх не бралася пад увагу дзейнасць дзяцей. Ва ўсіх прапанаваных сістэмах галоўную ролю ў выхаванні прыпісвалі настаўніку. Вучань заставаўся ў ролі слухача і выканаўцы.

Улічваючы сур'ёзныя недахопы ў арганізацыі працэсу выхавання, сучасная педагагічная літаратура адзначае, што ў аснову выхаваўчай работы ў школе павінна быць пакладзена выхоўваючая дзейнасць, а не стары яе змест, як гэта было раней.

Адзначанае вышэй дае нам падставу гаварыць аб тым, што праблема арганізацыі выхоўваючай дзейнасці – адна з актуальных праблем сучаснай педагагічнай навукі.

Вызначым сутнасць новага паняцця. Лагічна будзе разглядаць яго ў параўнанні з паняццем "выхаваўчая дзейнасць". Па-першае, трэба адзначыць, што з'яўленне тэрміна "выхоўваючая дзейнасць" ні ў якім разе не прыніжае значэння і не выцясняе з педагагічнай літаратуры існуючы да цяперашняга часу тэрмін "выхаваўчая дзейнасць".

Вядома, што выхаванне як форма далучэння маладога пакалення да жыцця існуе ў грамадстве на працягу ўсёй гісторыі. І як толькі выхаванне пачало быць спецыяльна арганізаваным, тэрмін "выхаваўчая дзейнасць" пачаў займаць галоўнае становішча, падкрэсліваючы тым самым рашаючую ролю дзейнасці выхавальніка ў фарміраванні асобы. Сама ж выхаваўчая дзейнасць і да цяперашняга часу з'яўляецца прадметам даследавання.

У педагагічнай літаратуры мінулых гадоў неаднаразова падкрэслівалася палажэнне аб тым, што выхаванне як грамадская з'ява з'яўляецца спецыфічнай выхаваўчай дзейнасцю па падрыхтоўцы падрастаючага пакалення да жыцця. Педагогі (К.Дз.Ушынскі, П.П.Блонскі, Н.К.Крупская, А.С.Макаранка, В.А.Сухамлінскі і інш.) акцэнтуюць увагу не толькі на спецыфічнасці гэтай дзейнасці, але і на яе важнасці і неабходнасці. Яны абагульнілі векавы вопыт чалавецтва па выхаванню новых пакаленняў, абагацілі новымі дасягненнямі і лепш за папярэднікаў ажыццявілі ў сваёй практыцы.

Педагогі не ўяўлялі працэс выхавання без кіруючай дзейнасці выхавальнікаў. Выхавальнікі, па іх меркаванню, уздзейнічаюць на дзяцей, дасягаючы пры гэтым пастаўленых мэт. Вялікая заслуга класікаў педагагічнай думкі, на наш погляд, заключаецца ў тым, што яны вызначылі сутнасць выхаваўчай дзейнасці, паказалі шляхі і спосабы ўплыву на дзяцей, распрацавалі канкрэтныя метады выхавання. Аднак педагогі характарызавалі выхаванне толькі як выхаваўчую дзейнасць, выпускаючы з поля зроку самадзейнасць выхаванцаў. Праўда, у далейшым гэта памылка імі была выпраўлена.

Сучасная педагогіка разглядае выхаванне ўжо як двухбаковы працэс, у якім на першы план выступае ўзаемадзеянне выхавальнікаў і выхаванцаў, арганізацыя жыцця і дзейнасці апошніх (В.С.Багданава, З.І.Васільева, І.Д.Дземакова, Т.І.Ільіна, А.І.Кайраў, А.І.Кочатаў, Л.У.Кузняцова, Б.Ц.Ліхачоў, М.П.Осіпава, В.І.Пятрова, П.І.Підкасісты, І.П.Падласы, А.В.Сласценін).

Выхаванне, па вызначэнню А.В.Сласценіна, – гэта двухбаковы працэс, які мае на ўвазе як арганізацыю і кіраўніцтва, так і асабістую актыўнасць асобы. Згодна з меркаваннямі А.І.Кочатава, дзіця з'яўляецца не толькі аб'ектам, але і суб'ектам выхавання. Яно заўсёды ўдзельнічае ў асабістым развіцці.

Мы падзяляем пункт гледжання В.С.Багданавай і В.І.Пятровай, якія лічаць, што выхаванне з'яўляецца двухбаковым працэсам, які ўключае ў сябе,

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

з аднаго боку, выхаваўчую работу педагога, а з другога – аб'ект гэтай работы – дзяцей, якія ўключаюцца ў актыўную дзейнасць пад уплывам выхавальніка, яго мэтанакіраваных педагагічных уздзеянняў.

У прыведзенных азначэннях гаворка ідзе аб спецыяльна арганізаванай выхаваўчай дзейнасці, і гэта дзейнасць асацыіруецца з пэўным уздзеяннем. Між тым, самі педагогі адзначаюць, што знешняе выхаваўчае ўздзеянне не заўсёды вядзе да патрэбнага рэзультату. Заўважана, што ўздзеянне можа выклікаць у выхаванца як станоўчую, так і адмоўную рэакцыю. Вылучаная ў працэсе выхавання дзейнасць дзяцей сама па сабе не будзе мець патрэбнага выхаваўчага значэння, калі няма пэўнага мэтанакіраванага кіраўніцтва ёю, калі не выкарыстоўваюцца педагагічна апраўданыя метады ўздзеяння на школьнікаў. Большасць аўтараў прытрымліваецца таго меркавання, што толькі пры ўмове, калі выхаваўчае ўздзеянне выклікае ў асобы ўнутраную станоўчую рэакцыю (адносіны) і ўзбуджае яе асабістую актыўнасць у рабоце над сабою, садзейнічае дасягненню станоўчага выніку.

У ходзе аналізу становішча выхаваўчай работы ў сучаснай школе гэта супярэчнасць была выдзелена Н.Я.Шчурковай. На думку педагога, рашыць дадзеную супярэчнасць можна шляхам арганізацыі выхоўваючай дзейнасці.

У кароткім даведніку па педагагічнай тэхналогіі, распрацаванай Н.Я.Шчурковай і яе калегамі, упершыню даецца навуковае азначэнне паняцця "выхоўваючая дзейнасць", якое, на наш погляд, раскрывае яе сутнасць, абагачае педагагічную навуку новым накірункам у арганізацыі выхаваўчай работы ў школе. Асабліва важна ўсвядоміць і вырашыць дадзеную праблему ў перыяд рэформы агульнаадукацыйнай школы. Гэта дапаможа выключыць з практыкі школы бессістэмны набор разнапланавых мерапрыемстваў, якія не даюць магчымасці для раскрыцця індывідуальных асаблівасцей дзіцяці, яго прыродных задаткаў і здольнасцей.

Праблема арганізацыі выхоўваючай дзейнасці ў цяперашні час даследуецца толькі невялікай групай вучоных (П.І.Піцюкоў, І.В.Бабурова, В.Н.Лукашонак, А.А.Осіпава, Л.Д.Рагозіна, П.І.Арапава, А.П.Саўчанка, Л.Т.Цян, Н.Я.Шчуркова). Яшчэ да выхаду ў свет даведніка па педагагічнай тэхналогіі Н.Я.Шчуркова неаднаразова спрабавала ўвесці новы тэрмін у педагагічную літаратуру, не даючы выразнага паняцця дадзенай катэгорыі.

Лічым важным адзначыць, што тэрмін "выхоўваючая дзейнасць" у педагогіцы не зусім новы. Ён з'явіўся ў канцы 60-х гадоў, але шырокага распаўсюджання ў тэорыі і практыцы выхавання не атрымаў з-за няяснасці сэнсу і нераспрацаванасці самой праблемы.

Разглядаючы выхаванне як працэс, які патрабуе ўтварэння ўяўленняў дзіцяці, яго пачуццяў, перакананняў і ўчынкаў, Э.С.Кузняцова так вызначае мэту выхавання: "...выхоўваць пэўны тып чалавека з развітымі магчымасцямі, з правільнымі адносінамі да людзей" [1]. У дасягненні пастаўленай мэты яна адводзіць рашаючую ролю арганізацыі выхоўваючай дзейнасці. Пад выхоўваючай дзейнасцю педагог разумеў дзейнасць саміх дзяцей, якая ўтварае тып чалавека-калектывіста.

Зусім відавочна, што такое азначэнне не раскрывае сутнасці выхоўваючай дзейнасці, не дае выразнага ўяўлення пра яе, але педагог зазначае, што выхоўваючай дзейнасць можна лічыць толькі тады, калі пры яе арганізацыі будуць улічаны наступныя патрабаванні:

– яснасць для дзяцей грамадскага сэнсу і значэння іх дзейнасці;
– адпаведнасць зместу дзейнасці ўзроставым асаблівасцям школьнікаў;
– нагляднасць і адчувальнасць яе вынікаў;
– неабходнасць прыкладання намаганняў дзяцей для пераадолення цяжкасцей і магчымасцей праяўлення творчай ініцыятывы.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Далейшы аналіз поглядаў Э.С.Кузняцовай на арганізацыю ўсёй жыццядзейнасці школьнікаў дазволіў выдзеліць істотныя рысы выхоўваючай дзейнасці – гэта творчая дзейнасць дзяцей, кіруемая педагогам, якая адпавядае іх узроставым асаблівасцям, мае грамадскі сэнс і адчувальныя для дзяцей вынікі. Мы прытрымліваемся пункту погляду Н.Я.Шчурковай, якая вызначае выхоўваючую дзейнасць як арганізаванае ўзаемадзеянне дзіцяці з аб'ектамі навакольнага свету, як фарміраванне сацыяльна-цэннасных адносін да іх.

Аналіз паняцця "выхоўваючая дзейнасць", дадзенага Н.Я.Шчурковай, дазволіў вылучыць істотныя характарыстыкі названай дзейнасці, вылучыць галоўныя адрозненні дадзенага паняцця ад паняцця "выхаваўчая дзейнасць".

Характэрнымі асаблівасцямі, на наш погляд, з'яўляюцца:

– па-першае, дзейнасць саміх дзяцей, якія яе плануюць, рыхтуюцца да ажыццяўлення, ажыццяўляюць, атрымліваючы пры гэтым пэўныя рэзультаты, падводзяць вынік гэтай дзейнасці;

– па-другое, у працэсе дзейнасці дзіця ўключаецца ва ўзаемаадносіны з аб'ектамі навакольнага свету, што дазваляе яму атрымаць багаты жыццёвы вопыт, станоўчыя эмоцыі;

– па-трэцяе, вынікам гэтай дзейнасці з'яўляюцца сацыяльна-цэннасныя адносіны.

Напрошваецца пытанне, якая роля выхавальніка ў дадзенай дзейнасці. Мяркуем, што не ўлічваць ролю выхавальніка нельга. На наш погляд, арганізацыя гэтай дзейнасці, яе ход павінны быць пад кіраўніцтвам выхавальніка, што дапаможа ёй пазбавіцца стыхійнасці і выпадковых вынікаў.

Названыя намі характарыстыкі дапамагаюць зрабіць вывад аб неадпаведнасці паняццяў "выхоўваючая дзейнасць" і "выхаваўчая дзейнасць". Паняцце "выхоўваючая" ідзе побач з сучаснасцю, імкнецца абапірацца на максімальную актыўнасць асобы ў працэсе яе асабістай дзейнасці, у той час як " выхаваўчая дзейнасць", як і раней, павінна аказваць уздзеянне на асобу пры дапамозе розных метадаў і прыёмаў, вядомых у педагогіцы.

Вялікая заслуга Н.Я.Шчурковай і яе калег заключаецца ў тым, што акрамя азначэння сутнасці выхоўваючай дзейнасці, яны выявілі яе структуру, прынцыпы, функцыі, вызначылі педагагічныя ўмовы арганізацыі гэтай дзейнасці, распрацавалі яе змест.

Большасць педагогаў адзначае, што педагагічнае кіраўніцтва дзейнасцю дзяцей абапіраецца на яе структуру. Заўважана, што ў структуры дзейнасці, у яе звёнах ужо закладзены выхаваўчыя магчымасці, якія настаўнік можа актыўна і з поспехам выкарыстоўваць у рабоце з дзецьмі. Педагогі падкрэсліваюць, што няма дзейнасці там, дзе няма цэласнага ланцуга "мэта – матыў – сродкі – дзеянне – рэзультат".

Гаворачы аб структуры выхоўваючай дзейнасці, Н.Я.Шчуркова ўказвае на тое, што яна мае такія ж элементы, як і прадметная дзейнасць: патрэбнасць, матыў, мэта, усведамленне сродкаў, аперацыя дзеянне, аналіз і ацэнка рэзультату, карэктыроўка мэты.

У дадзенай структуры, па меркаванню даследчыкаў, зыходным кампанентам з'яўляецца мэта. Усведамляючы мэту дзейнасці, дзіця праяўляе актыўнасць, прыкладваючы пры гэтым фізічныя і духоўныя намаганні.

Не менш важным кампанентам дзейнасці лічыцца матыў. Гэта тое, што пабуджае да дзейнасці, з'яўляецца яе падставай.

Неабходнасць разгляду выхавальнікамі розных відаў дзеянняў, г.зн. аперацый, накіраваных на дасягненне пастаўленай мэты, вызначаецца тым, падкрэсліваюць некаторыя педагогі, што іменна дзеянні выражаюць адносіны асобы да навакольнага свету.

Акцэнтуючы ўвагу на рэзультаце дзейнасці, педагогі адзначаюць, што для атрымання выніку дзіця выкарыстоўвае розныя сродкі, суадносіць тое, што атрымліваецца ў ходзе яго дзеянняў з ідэальна існуючым у яго галаве канчатковым рэзультатам. Па вызначэнню У.В.Кабуша, рэзультат дзейнасці – гэта якасці асобы.

Педагогі (В.С.Багданава, Я.В.Бандарэўская, І.П.Іваноў, У.Т.Кабуш, В.О.Куцьеў, І.С.Мар'енка, М.П.Осіпава, В.І.Пятрова, Л.І.Рувінскі, І.П.Падласы, І.Ф.Харламаў, Н.Я.Шчуркова і інш.) лічаць, што для таго, каб дзейнасць прыносіла карысць дзіцяці, яна павінна быць разнастайнай. Разнастайнасць дзейнасці, як вядома, вядзе да развіцця рознабаковых уменняў і навыкаў, фарміравання пэўных маральных рыс і якасцей. У сувязі з гэтым педагогі прапаноўваюць выхавацелям арганізоўваць з дзецьмі розныя віды дзейнасці.

М.П.Осіпава ў выхаванні і развіцці асобы адводзіць вялікае месца такім відам дзейнасці, як пазнавальная, працоўная, гульнёвая, мастацкая, сацыяльна-арыентацыйная.

І.П.Падласы ў якасці асноўных відаў дзейнасці, якія спрыяюць фарміраванню асобы дзіцяці, выдзяляе пазнавальную, грамадскую, спартыўную, мастацкую, тэхнічную, рамесніцкую, геданічную, дзейнасць свабодных зносін.

В.О.Куцьеў лічыць, што выхоўваючыя магчымасці закладзены ў наступных відах дзейнасці: грамадска-арганізацыйнай, пазнавальнай, працоўнай, эстэтычнай і спартыўнай.

Некаторыя аўтары (В.С.Багданава, Я.В.Бандарэўская), побач з вышэй названымі, вылучаюць маральную дзейнасць і лічаць яе рэальным сведчаннем маральнай выхаванасці. Так, Я.В.Бандарэўская адводзіць галоўную ролю маральнай дзейнасці ў развіцці і пераўтварэнні маральных адносін. Асаблівасцю гэтай дзейнасці, па яе меркаванню, з'яўляецца тое, што ў адрозненне ад іншых відаў, якія маюць прадметную накіраванасць, яе змест рэалізуецца не ў аперацыях, а ва ўчынках, якія падлягаюць маральнай ацэнцы.

Як вядома, змест любога віду дзейнасці спрыяе ўзбагачэнню ведаў вучняў, набыццю маральна-цэннаснага вопыту. Як адзначае Г.І.Шчукіна, прызначэннем любой дзейнасці з'яўляецца "прысваенне" яе зместу суб'ектам. "Падабраць неабходны змест, адпаведны пастаўленым мэтам..., забяспечыць умовы для паспяховага авалодання ім выхаванцамі – такая задача педагагічнага працэсу" [2].

Раскрываючы сутнасць выхоўваючай дзейнасці, Н.Я.Шчуркова ўказвае на неабходнасць уключэння ў яе змест такіх відаў, як:

– пазнавальнай – узбагачаючай уяўленні вучняў аб навакольным свеце, дзейнасці, у якой вылучаецца, адкрываецца, разумеецца ісціна;

– грамадска-карыснай – накіраванай на агульную карысць і радасць іншых людзей; у гэтай дзейнасці дэкларыруюцца, прапагандуюцца, распаўсюджваюцца сацыяльна-цэнная ідэі;

– цэннасна-арыентаванай – раскрываючай вучням духоўныя і матэрыяльныя, сацыяльна-значныя каштоўнасці і арыентуючай на іх паводзіны дзяцей;

– мастацка-творчай – дазваляючай рэалізаваць індывідуальныя творчыя задаткі і магчымасці, дзе ўспрымаецца, інтэрпрэтуецца, ствараецца, аднаўляецца, трансліруецца мастацкі вобраз;

– працоўнай – дзейнасці, у якой ствараюцца, захоўваюцца, удасканальваюцца матэрыяльныя каштоўнасці;

– дзейнасці свабодных зносін – арганізуючай вольны час дзяцей;

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

– фізкультурнай – прызначэнне якой садзейнічаць умацаванню, удасканальванню чалавечага цела.

Аднак трэба адзначыць, Н.Я.Шчуркова не разглядае такі від дзейнасці, як гульнёвая, і не ўключае яе ў змест выхоўваючай дзейнасці. Педагог лічыць, што арганізацыя гульнёвай дзейнасці не ўваходзіць у кола прамых абавязкаў класнага кіраўніка.

Падобныя адносіны да гульні мы лічым не зусім справядлівымі. У шматлікіх працах педагогаў мінулага (К.Дз.Ушынскі, П.Ф.Лесгафт, А.С.Макаранка, Н.К.Крупская, В.А.Сухамлінскі) і сучасных даследчыкаў дадзенай праблемы (Н.П.Анікеева, М.А.Бесава, Л.Р.Балоціна, Л.В.Былеева, А.С.Газман, Дз.І.Латышына, М.Ф.Літвінава, Л.Г.Лысюк, Я.М.Мінскін, З.А.Міхайлава, Б.П.Нікіцін, С.П.Папоў, Н.Я.Харытонава, С.А.Шмакаў, М.Г.Яноўская і інш.) паказана значэнне гульні і гульнёвых практыкаванняў у выхаванні і развіцці дзяцей, у фарміраванні станоўчых адносін да вучобы, ведаў, працы людзей, прыроды, грамадства.

Н.К.Крупская адводзіла рашаючую ролю гульнёвай дзейнасці ў пазнанні і развіцці дзіцяці, падкрэслівала сувязь гульні з навучаннем і працай, разглядала гульню як актыўны сродак выхавання асобы.

А.С.Макаранка бачыў значэнне гульні ў працы і грамадскай дзейнасці.

П.Ф.Лесгафт лічыў гульню адным з дзейсных сродкаў фізічнай адукацыі і выхавання.

Але найбольш удала, на наш погляд, вызначыў сутнасць гульні і яе значнасць для дзіцяці К.Дз.Ушынскі: "Для дзіцяці гульня – рэчаіснасць, і рэчаіснасць значна больш цікавая, чым тая, якая яго акружае. Цікавейшая яна для дзіцяці іменна таму, што зразумелая; а зразумелая яна таму, што часткова ёсць яго асабістае тварэнне. У гульні дзіця жыве, і сляды гэтага жыцця глыбей застаюцца ў ім, чым сляды рэальнага жыцця, у якое ён не змог яшчэ ўвайсці з-за складанасці яго з'яў і інтарэсаў. У рэальным жыцці дзіця не больш, як дзіця, істота, якая не мае яшчэ ніякай самастойнасці, слепа і бестурботна зацягнутая плынню жыцця; у гульні ж дзіця ўжо сталеючы чалавек, спрабуе свае сілы і самастойна распараджаецца сваімі ж тварэннямі" [3].

Важным момантам у даследаванні выхоўваючай дзейнасці з'яўляецца пытанне аб яе прынцыпах. Вядома, што пры арганізацыі любога віду дзейнасці загадзя прадумваецца рад момантаў, якія можна размясціць паслядоўна па пэўнай лагічнай сістэме. Дадзеныя палажэнні прынята называць прынцыпамі. Улік асноўных прынцыпаў дапамагае арганізатарам дзейнасці праводзіць яе на належным узроўні. І, наадварот, пры зняважлівых адносінах да іх, дзейнасць можа быць сарвана, а мэта яе не дасягнута.

Педагогі А.А.Осіпава, П.Ю.Піцюкоў, А.П.Саўчанка, Н.Я.Шчуркова выдзяляюць рад асноўных палажэнняў, на якія павінны абапірацца выхавальнікі пры арганізацыі дзейнасці дзяцей:

– мэта дзейнасці павінна супадаць з яе матывамі. Захаванне дадзенага прынцыпу ўтварае больш трывалую матывацыю дзіцяці, вызначае канкрэтныя дзеянні суб'екта і арганізуе іх;

– арганізуемая дзейнасць – самадзейнасць дзяцей. Сутнасць дадзенага прынцыпу заключаецца ў тым, што дзеці выступаюць суб'ектам дзейнасці: плануюць яе, рыхтуюць, здзяйсняюць і ацэньваюць. Роля ж педагога – назіраць, даваць неабходны інструктаж, удзельнічаць у ацэнцы рэзультату дзейнасці. Па меркаванню даследчыкаў, асноўная памылка, якую дапускаюць арганізатары дзейнасці, заключаецца ў тым, што яны імкнуцца рабіць за дзіця многае, апякаюць яго, накіроўваюць кожнае дзеянне. І гэта перашкаджае яму

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

зрабіць пераход ад знешне накіроўваемай дзейнасці да самадзейнасці. Такая пазіцыя педагога недапушчальная пры арганізацыі любой дзейнасці, тым больш выхоўваючай;

– пастаяннае ўскладненне дзейнасці. Гэты прынцып прадугледжвае ўскладненне і змяненне зместу дзейнасці дзяцей, форм і метадаў яе арганізацыі. Лічыцца, што прапаноўваемая дзейнасць павінна быць даступнай дзецям, але ў той жа час трэба, каб яе змест патрабаваў ад іх некаторых намаганняў. Пашырэнне і ўскладненне шэрагу самастойных дзеянняў спрыяльна ўплывае на развіццё асобы;

– у арганізуемай дзейнасці неабходна ствараць сітуацыю поспеху. Вядома, што толькі тая дзейнасць, якая прыносіць поспех і задавальняе суб'екта, становіцца для яго фактарам развіцця. Пад сітуацыяй поспеху Н.Я.Шчуркова разумее суб'ектыўнае адчуванне, асаблівы стан задавальнення вынікам фізічнага і псіхічнага напружання справы;

– вызначэнне аб'екта дзейнасці. Аб'ектамі выхоўваючай дзейнасці могуць выступаць прадметы і з'явы навакольнага свету: веды, ісціна, матэрыяльныя каштоўнасці, мастацкі вобраз, чалавечае цела, ідэі, іншы суб'ект. Дасканалае вызначэнне суб'екта дапамагае дзіцяці зрабіць дзейнасць больш мэтанакіраванай і тым самым садзейнічаць паспяховаму дасягненню рэзультату;

– улік тэхналагічных правіл арганізацыі выхоўваючай дзейнасці: строгае абмежаванне часу дзейнасці, дакладна абмежаваны аб'ём дзейнасці, вызначэнне асноўнай ролі ўсіх удзельнікаў групавой справы, а таксама папярэдні падбор і падрыхтоўка сродкаў і інструментаў дзейнасці. Захаванне гэтага прынцыпа папярэджвае стыхійнасць у арганізацыі дзейнасці, садзейнічае выхаванню адказных адносін да яе, дысцыплінаванасці і арганізаванасці дзяцей, дапускае паспяховае здзяйсненне і дасягненне станоўчага рэзультату.

Заслугоўвае ўвагі пытанне аб формах арганізацыі выхоўваючай дзейнасці. Пры разглядзе рада даследаванняў (М.А.Бесава, І.П.Іваноў, М.П.Осіпава, Н.Я.Шчуркова і інш.), прысвечаных вывучэнню форм выхаваўчай работы, а такім чынам, і арганізацыі дзейнасці дзяцей, заўважана, што адносна формаў арганізацыі выхоўваючай дзейнасці аднадушнасці ў педагогаў няма. Адны аўтары выдзяляюць творчыя святы, творчыя гульні, выхаваўчыя мерапрыемствы, калектыўныя творчыя справы (М.А.Бесава, І.П.Іваноў); іншыя, побач з вышэй адзначанымі формамі, называюць экскурсіі і падарожжы (М.П.Осіпава); трэція вялікую ролю ў фарміраванні адносін да навакольнага свету адводзяць выхаваўчаму мерапрыемству (яно ж ёсць групавая справа) і калектыўным творчым справам (Н.Я.Шчуркова).

Эфектыўнасць выхоўваючай дзейнасці залежыць ад умоў яе арганізацыі, якія надаюць ёй выхоўваючы характар. На аснове аналізу работ В.Т.Кабуша, В.Ю.Піцюкова, Л.Д.Рагозінай, Н.Я.Шчурковай і іншых можна выдзеліць наступныя ўмовы выхоўваючай дзейнасці:

1. Стваральнасць дзейнасці (В.Т.Кабуш, Н.Я.Шчуркова).

Н.Я.Шчуркова выдзяляе гэту ўмову ў якасці асноўнай, акцэнтуючы ўвагу на тым, што прысутнасць стваральнай працы ў дзейнасці выключае імкненне да разрушальнай. Педагог паказвае стваральную магчымасць розных відаў дзейнасці: "...у працы ствараць матэрыяльныя сродкі; у пазнанні адкрываць аб'ектыўныя заканамернасці; у зносінах транслiраваць сваё "Я"; у мастацкай дзейнасці ўзнаўляць прыгажосць; у грамадскай – вылучаць ідэі і адстойваць іх; у цэннасна-арыентаванай – разумець адну з тайнаў шчаслівага жыцця; у спартыўнай – ляпіць сваё цела моцным, лоўкім, прыгожым" [4].

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

В.Т.Кабуш прытрымліваецца думкі Н.Я.Шчурковай аб стваральнай дзейнасці, указвае пры гэтым: "Дзейнасць, якая разбурав свет, разбурае і чалавека. Дзейнасць, якая пераўтварае свет, фарміруе чалавека" [5].

2. Высокая матываванасць дзейнасці (В.Т.Кабуш, Н.Я.Шчуркова).

Лічачы матыў зыходным момантам у арганізацыі дзейнасці, педагогі адзначаюць, што арганізацыя любой справы ўпіраецца ў матывацыю. Іменна матывацыя накіроўвае актыўнасць дзяцей на цэннасці.

3. Рэфлексія (Н.Я.Шчуркова).

Пад рэфлексіяй Н.Я.Шчуркова разумеє аналіз самім вучнем асабістага стану яго думак па завяршэнні дзейнасці. Назначэнне рэфлексіі – "спрыяць фарміраванню суб'екта, які ўдзельнічае ў дзейнасці і здольны ажыццявіць свабодны выбар..." [6].

4. Свабодны пераход ад аднаго віду дзейнасці да другога.

У педагагічнай літаратуры адзначаецца, што пры дапамозе гэтай умовы ажыццяўляецца змена імкненняў і матываў асобы. Іменна змена сацыяльнай пазіцыі і розных відаў дзейнасці аказвае дапамогу ў пераадольванні маральнага эгацэнтрызму, у фарміраванні ў выхаванца здольнасці спачуваць іншым людзям.

5. Улік ступені сацыяльных адносін (Н.Я.Шчуркова).

У даведніку па педагагічнай тэхналогіі ўказваецца, што выхавальнік павінен улічваць сістэму сацыяльных адносін для таго, каб аказваць дапамогу вучню ў асваенні і авалоданні сацыяльна-цэннаснымі адносінамі.

6. Калектыўны характар дзейнасці (У.Т.Кабуш).

Так, у даследванні У.Т.Кабуша звяртаецца ўвага на тое, што выхоўваючая значнасць дзейнасці павышаецца, калі яна носіць калектыўны характар. Пры гэтым педагог прытрымліваецца меркавання, што калектыўная дзейнасць спрыяе памяншэнню ступені рызыкі пры выкананні працы, пры выяўленні гатоўнасці дзяцей да ўдзелу ў сумеснай дзейнасці, у абмене жыццёвым вопытам. Пры гэтым педагог падкрэслівае, што гэта адбываецца ў тым выпадку, калі мэта дзейнасці ўсведамляецца выхаванцамі як калектыўная, якая патрабуе абавязковага аб'яднання намаганняў.

Аналіз даследаванняў, праведзеных педагогамі па праблеме арганізацыі выхоўваючай дзейнасці, дазволіў нам убачыць актуальнасць дадзенай праблемы, устанавіць ступень яе распрацоўкі ў педагагічнай літаратуры. На наш погляд, тое, што зроблена аўтарамі ў гэтым накірунку, трэба разглядаць толькі як першыя крокі ў вырашэнні дадзенай праблемы. Зусім відавочна, неабходны спецыяльныя даследаванні выхоўваючай дзейнасці, якія дапамогуць пазбавіцца ўстарэлых традыцыйных форм і метадаў арганізацыі выхаваўчай работы ў школе, зрабіць працэс выхавання дзяцей больш дасканалым.

## ЛІТАРАТУРА


1. Методика воспитательной работы / Состав. ***Э.С.Кузнецова, А.М.Бардиан.*** – М.: Просвещение, 1967. – С. 5.
2. ***Щукина Г.И.*** Активизация познавательной деятельности учащихся в учебном процессе. – М., 1979. – С. 15.
3. ***Ушинский К.Д.*** Избранные педагогические сочинения: В 2 т. – Т.1: Человек, как предмет воспитания. – М., 1974. – 354 с.
4. ***Шчуркова Н.Е., Питюков В.Ю., Савченко А.П., Осипова Е.А.*** Новые технологии воспитательного процесса. – М., 1993. – С. 25.
5. ***Кабуш В.Т.*** Гуманистическая система воспитания. – Мн., 1997. – С. 42.
6. ***Щуркова Н.Е.*** Воспитание: Новый взгляд с позиции культуры. – М., 1997. – С. 27.


Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова